# ШАНС-ВІКТАРЫНА “БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНЯРЫ”

## ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ ЯНКІ КУПАЛЫ

1. Якое сапраўднае прозвішча Янкі Купалы?

*А)Іван Дамінікавіч Луцэвіч*

*Б) Казімір Іванавіч Хворы*

2. Калі і дзе нарадзіўся паэт?

*А) 7 ліпеня 1882 г. у фальварку Вязынка*

*Б) 8 снежня 1882 г. у мястэчку Зэльва*

3. Якое дачыненне да Янкі Купалы маюць наступныя ўласныя назоўнікі: "Вайдэлота, Левы, Вінцук з-пад Мінска"?

*А) Псеўданімы паэта*

*Б) Назвы твораў*

4. У якіх мясцінах прайшло Купалава дзяцінства?

*А) На Міншчыне, Лагойшчыне*

*Б) На Гродзеншчыне, у в.Котра*

5.Кім давялося працаваць Я. Купалу ў 1902 - 1907 гг.?

*А) Арандатарам, хатнім настаўнікам, пісарам судовага следчага, служачым канторы*

*Б) Прыказчыкам, чорнарабочым на бровары, памочнікам вінакура*

6.Што такое "бровар"?

*А)Вінакурны завод*

*Б) хатняя жывёла*

7.Дзе жыў Янка Купала ў 1908 г.?

*А) У Вільні*

*Б) У Смаргоні*

8.Кім ён працаваў там?

*А) Бібліятэкарам у прыватнай бібліятэцы Даніловіча, супрацоўнічаў з газэтай "Наша Ніва "*

*Б) Настаўнікам*

9.Як назваў паэт свой першы зборнік?

*А) "Жалейка "*

*Б) "Спадар"*

10.Як называецца перыяд жыцця Я. Купалы з 1909 да 1913 г.?

*А) Пецярбургскі перыяд*

*Б) Зорны перыяд*

11.Пад чыім уплывам пачынаў Я. Купала пісаць вершы?

*А) Пад уплывам Францішка Багушэвіча*

*Б) Макіма Танка*

12.Які зборнік выйшаў у 1910 г.?

*А) "Гусляр"*

*Б) "Вянок"*

13.Што за зборнік убачыў свет у 1913 г.?

*А) "Шляхам жыцця*

*Б) "Спадчына"*

14.Якая падзея адбылася 23 студзеня 1916 г. у жыцці Янкі Купалы?

*А) Ён пабраўся з Уладзіслававай Францаўнай Станкевіч*

*Б) Пераехаў жыць за мяжу*

17. Які першы друкаваны твор Янкі Купалы?

*А)Верш "Мужык "*

*Б) Паэма "Новая зямля"*

18. Як называецца верш пра паход народа ў будучыню, у шырокі свет з прагай звацца людзьмі?

*А) "А хто там ідзе?"*

*Б) "А хто там бяжыць"*

19. У якім зборніку гучыць не толькі голас лірычнага героя - мужыка, а найперш песня пра народ вуснамі музыкі, за якога выдае сябе паэт?

*А) "Гусляр"*

*Б) “Ноч”*

20. Якая Купалава кніга распавядае пра жыццёвы шлях паэта і шляхі народнага жыцця, паказвае вобразы мужыка і народа, вобразы гусляроў, перш за ўсё - духоўнае жыццё песняра маладой Беларусі?

*А) "Шляхам жыцця "*

*Б) “Смутныя думкі”*

23.З якім творам Адама Міцкевіча перагукаюцца Купалавы вершы "У вечным боры...", "Ноч за ночкай" (дзе вадзянікі, лесуны, русалкі спраўляюць бяседу, змей цягне дабро з пуняў)?

*А) З паэмай "Дзяды "*

*Б) З паэмай “Лесуны”*

24. З якім творам старажытнай літаратуры перагукаецца верш Я. Купалы?

І вось жніва, што за жніва!

Бокам, сторчам, проста, крыва

-Труп ля трупа, як кал оды...

Што за сон, што за выгоды!

Не на смехі, не на жарт,

Ката - брат, кат брата варт!

*А) “Слова пра паход Ігаравы”*

*Б) “ Энеіда навыварат”*

25. Як называецца санет, што адказвае на пытанні, дзе нарадзіўся Янка Купала, што ёсць для яго Бацькаўшчына і як ён з ёю паяднаны?

*А)"Бацькаўшчына "*

*Б) “Родны край”*

26.Песняра пахавалі 1 ліпеня 1942 г. на Ваганькаўскіх могілках у Маскве, а дзе ён пахаваны цяпер?

*А) На Вайсковых могілках у Мінску, побач з Якубам Коласам*

*Б) У фальварку Вязынка*

## ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ ЯКУБА КОЛАСА

1. Калі і дзе нарадзіўся Якуб Колас?

*А) 3 лістапада 1882 г. у в. Акінчыцы каля Стоўбцаў*

*Б) 5 лютага 1882 г. у Навагрудку*

2. Якое сапраўднае прозвішча Якуба Коласа?

*А) Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч*

*Б) Мікалай Мікалаевіч Чорны*

3. У колькі гадоў пачаў спрабаваць літаратурныя сілы Кастусь?

*А) У 12*

*Б) У 18*

4. Што даў бацька сыну за чытанне верша "Вясна"?

*А) Сярэбраны рубель*

*Б) Цукерку*

5. Які верш пад псеўданімам "Якуб Колас" упершыню быў надрукаваны ў газеце "Наша Доля" ў 1906 г.?

*А)"Наш родны край"*

*Б) "Мой мілы друг"*

6. З 1890 да 1902 г. бацька паэта служыў у леснічоўцы Альбуць, а як называецца Альбуць у паэме "Новая зямля"?

*А) Парэчча*

*Б) Зарэчча*

7.За што Якуб Колас тры гады правёў у турме?

*А) За ўдзел у настаўніцкім з'ездзе*

*Б) За выпуск забароненай літаратуры*

8.Які зборнік вершаў Я. Коласа выйшаў у 1910 г.?

*А) "Песні-жальбы"*

*Б) "Вянок"*

9.Якім яшчэ псеўданімам у дакастрычніцкі час падпісваў Я. Колас свае творы? *А) Тарас Гушча*

*Б) Міхась Пушча*

10.Якая назва верша?

Ой ты, вецер неспакойны,

Ты мой брат па долі!

Раскідаем смех і слёзы

Мы у чыстым полі.

*А) "Вецер"*

*Б) “Човен”*

11. Колькі дзяцей было ў сям'і Міхала Казіміравіча і Ганны Юр'еўны Міцкевічаў?

*А)  13 (чацвёра памерлі,выжылі дзевяць: пяць сыноў і чатыры дачкі)*

*Б) 5*

12. У якім творы такое знаёмае Я. Коласу сяло Мікалаеўшчына апісана як сяло Мікуцічы?

*А) У трылогіі "На ростанях "*

*Б) У паэме “Новая зямля”*

13. На ніцях белай павуціны

Прывозяць восень павучкі -

з якой паэмы гэтыя радкі?

*А) "Новая зямля”*

*Б) “Сымон-музыка”*

14. Хто такі Янка Базылёў у паэме "Новая зямля"?

*А) Дарэктар*

*Б) Рыбак*

15.Хто галоўныя героі аповесці "На прасторах жыцця"?

*А) Сцяпан Барута і Аленка Гарнашка*

*Б) Яўхім і Ганна Чарнушка*

16.Што спяваў дрозд з казкі "У чым іх сіла"?

*А) "Сіла ў калектыве"*

*Б) “Сіла ў навуцы”*

17. Каму прысвечаны Коласаў верш "Над магілаю друга"?

*А) Янку Купалу*

*Б) Адаму Міцкевічу*

18. Рускае слова "трясина". А як па-беларуску называецца твор Я. Коласа?

*А) "Дрыгва”*

*Б) “Вір”*

19. Пра якую паэму Кандрат Крапіва зазначыў, што яна з'яўляецца сапраўднай жамчужынай у беларускай літаратуры?

*А) Пра "Новую зямлю"*

*Б) Пра “Рыбакову хату”*

20. Прадоўжыце радкі з паэмы "Новая зямля":

Мой родны кут!..

Як ты мне мілы!..

*А) Забыць цябе не маю сілы…*

*Б) Успомніць ніяк не магу*

21. Што за імёны «Агарак, Адзінокі, Альбуцкі К., Андрэй "сацыяліст", Груд Ганна, Гушча, Дземяноў Гуз, Дзядзька Карусь, Дубовы Ліст, Кудеснік, Стары шут, Торба Іван»?

*А) Псеўданімы Я. Коласа*

*Б) Псеўданімы М.Танка*

22. Што вырашаюць купіць Міхал і Антось у паэме "Новая зямля"?

*А) Зямлю*

*Б) Хату*

23. Які кампазітар паклаў на музыку тэкст з паэмы "Новая зямля"?

*А) Ігар МіхайлавічЛучанок*

*Б) Эдуард Сямёнавіч Ханок*